# Учора ў Доме ўрада адкрыўся XVI з'езд КП(б)Б

10 чэрвеня, у 6 гадзін вечара ў зале з'ездаў Дома ўрада адкрыўся XVI з'езд КП(б)Б. На з'езд прыбыло 666 дэлегатаў з рашаючым голасам і 146 дэлегатаў з дарадчым.

З'езд адкрыў кароткай уступнай прамовай сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч В. Ф.

## Уступная прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА В. Ф.

Таварышы, XVI з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі адкрываецца ў вельмі адказны перыяд для нашай краіны. З'езд адкрываецца пасля ўвядзення Сталінскай Канстытуцыі, якая знамянуе паварот у палітычным жыцці нашай краіны.

XVI з'езд КП(б)Б адкрываецца пасля гістарычнага лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), пасля гістарычнага даклада і заключнага слова таварыша Сталіна, які ўзброіў нашу партыю, нашу краіну, у тым ліку і КП(б)Б і ўвесь беларускі народ для барацьбы за новыя перамогі і новыя поспехі, для барацьбы за соцыялізм, для барацьбы з ворагамі.

XVI з'езд Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі адкрываецца ў момант, калі пераможна выкапан па валавой прадукцыі план другой пяцігодкі і ўжо складаецца план трэцяй пяцігодкі, на выкананне якой мы павінны будзем аддаць усе нашы сілы, усю нашу энергію і мабілізаваць шматмільённы наш народ.

Таварышы, мы павінны памятаць і ні на мінуту не забываць папярэджання таварыша Сталіна аб тым, што мы знаходзімся і працуем у

тычнай работы, якія ўскрыў таварыш Сталін на лютаўскім Пленуме Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў, цалкам і поўнасцю мелі месца і ў нас, у КП(б)Б.

Мы павінны перабудаваць сваю работу так, каб яна была на ўзроўні задач, дыктуемых паваротам у палітычным жыцці краіны ў сувязі з увядзеннем новай Сталінскай Канстытуцыі.

Таварышы, мы павінны ўзняць большэвіцкую пільнасць. Усе факты паказваюць, што яна ў КП(б)Б не была на належнай вышыні, інакш ні чым іншым нельга вытлумачыць таго, што, не гледзячы на сігналы, астазаліся нявыкрытымі дэзерцір Чырвонай арміі і двурушнік Халасевіч, такія матёрыя ворагі народу, як Бенек, Дз'якаў і цэлы рад іншых праз'раных здраднікаў нашай радзімы.

Мы павінны знішчыць да канца рэшткі японa-нямецкіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, рэшткі трацкісцка-бухарынскай і нацыяналістычнай падалі, раздавіць і сцерці іх у парашок, як бы яны ні маскаваліся, у якую-б нару ні хаваліся.

Мы павінны сказаць на нашым з'ездзе адно: **смерць гэтым гадам здраднікам нашай радзімы.**

Мы павінны ўзняць яшчэ вышэй ідэйна-палітычную работу сярод комуністаў і беспартыйных рабочых калгаснікаў, інтэлігенцыі, сярод усіх працоўных. Мы павінны яшчэ больш узмацніць узбраенне мас вучэннем Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Няма такой сілы, якая-б прыпыніла пераможнае шэсціе рабочага класа да комунізма. Я думаю, што выкажу думку ўсіх дэлегатаў нашага з'езда, калі скажу, што ўся Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі аддасць усе свае сілы без астатка на службу справе партыі Леніна — Сталіна **(апладысменты)**, яшчэ больш умацуе сувязь з масамі і мабілізуе іх на барацьбу за новыя перамогі комунізма.

Таварышы, я заклікаю дэлегатаў з'езда падвергнуць бальшэвіцкай крытыцы і самакрытыцы ўсе нашы памылкі, недахопы і, у першую чаргу, памылкі, недахопы ЦК КП(б)Б, кіруючыся ўказаннямі таварыша Сталіна.

Няхай жыве наша вялікая магутная партыя!

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі!

Няхай жыве наш дарагі правадыр і настаўнік таварыш Сталін! **(Бурныя апладысменты, воклічы «ура» таварышу Сталіну, усе ўстаюць).**

Тав. Шаранговіч абвяшчае XVI з'езд КП(б)Б адкрытым.

***

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы